# НАВУКОВАЯ ШКОЛА ПА ВЫВУЧЭННІ ГІСТОРЫІ, АРХЕАЛОГІІ, ЭТНАГРАФІІ, АНТРАПАЛОГІІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ

Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт на сённяшні дзень з'яўляецца адным з буйнейшых цэнтраў па вывучэнні гісторыі і культуры Полацка і Паўночнай Беларусі.

З моманту заснавання кафедры гісторыі ў Полацкім дзяржаўным універсітэце плённа развіваюцца этналагічныя і палявыя этнаграфічныя даследаванні. Заснавальнікам этналагічнага накірунку з'яўляецца вядомы беларускі этнолаг, кандыдат гістарычных навук Уладзімір Аляксандравіч Лобач. На сённяшні дзень вакол У.А. Лобача сфарміравался кола з яго вучняў – кандыдат гістарычных навук Уладзімір Яўгенавіч Аўсейчык, кандыдат гістарычных навук Святлана Уладзіміраўна Андрыеўская, Вера Іванаўна Мішына, Аксана Юр'еўна Бабіч. Этнаграфічныя экспедыцыі выкладчыкаў і студэнтаў Полацкага ўніверсітэта за 1995–2017 гг. ахапілі ўсе без выключэння раёны Беларускага Падзвіння і дазволілі сабраць унікальны матэрыял па сямейнай і каляндарнай абраднасці, народнай медыцыне, фальклору, сакральнай геаграфіі і міфалогіі Паўночнай Беларусі. Знаёмства са скарбамі традыцыйнай беларускай культуры, якое адбылося ў часе этнаграфічнай практыкі, стала для многіх студэнтаў своеасаблівымі ўводзінамі ў свет этналагічнай навукі і знайшло сваё далейшае ўвасабленне ў курсавых і дыпломных работах, магістарскіх і нават кандыдацкіх дысертацыях. Вынікі этнаграфічных даследаванняў адлюстраваны ў манаграфіях, дзясятках навуковых артыкулаў, а таксама ў "Полацкім этнаграфічным зборніку", які атрымаў заслужанае прызнанне не толькі ў беларускіх, але і ў літоўскіх, польскіх, украінскіх і расійскіх этнолагаў і фалькларыстаў. Этнаграфічныя экспедыцыі і даследаванні не толькі адкрываюць для студэнтаў чароўны і непаўторны свет беларускай этнічнай культуры, але дазваляюць на свае вочы ўбачыць хараство роднай краіны, што нязмушана і арганічна выхоўвае сапраўдных патрыётаў Беларусі не на словах, а на справе.

З адкрыццём гістарычнай спецыяльнасці ў Полацкім дзяржаўным універсітэце з'явілася магчымасць правядзення планамерных археалагічных раскопак. Амаль за 20 гадоў сістэматычных археалагічных даследаванняў пад кіраўніцтвам былых выпускнікоў Полацкага ўніверсітэта, а зараз вядомых археолагаў – доктара гістарычных навук (на дадзены момант рэктара Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. А. Куляшова) Дзяніса Уладзіміравіча Дука, кандыдата гістарычных навук Ігара Уладзіміравіча Магалінскага, а таксама магістра гістарычных навук Аляксея Леанідавіча Коца – зроблены найважнейшыя археалагічныя адкрыцці ў гісторыі самага старажытнага горада на Беларусі – Полацка. Так, стала вядома, што горад Полацк як рэгіянальны цэнтр пачаў фарміравацца амаль на стагоддзе раней першай сваёй узгадкі ў летапісах. Старажытны цэнтр горада – Полацкае гарадзішча – з'яўляўся цэнтрам жыцця палачан не толькі ў IX–XI стст., але дзейнічаў ажно да XIV ст. Тут пражываў князь, магчыма, прадстаўнікі яго дружыны і заможнае баярства. Значнага тэрытарыяльнага пашырэння горад дасягнуў у XI–XII ст., калі былі заснаваны Вялікі і Запалоцкі пасад. Унікальны помнік археалогіі – Заходняя частка Запалоцкага пасада – быў адкрыты і даследаваны полацкімі археолагамі ў 2004 і 2013 гг. Адкрыццё месца знаходжання бернардзінскага кляштара, дзе атрымаў сваю першую адукацыю Францыск Скарына, вызначэнне планіроўкі старажытных вуліц і іх назваў, адкрыццё пасадаў правага берага Дзвіны, лакалізацыя курганных і шэрагу грунтовых могільнікаў горада – гэта далёка няпоўны пералік тых новых старонак гісторыі, якія раскрылі полацкія археолагі падчас раскопак.

Старажытны Полацк быў моцна звязаны эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі сувязямі з навакольнымі паселішчамі, таму тэма даследавання полацкай акругі таксама вельмі цікавая для археолагаў. Пачынаючы з 2011 г. пад кіраўніцтвам археолага, магістра гістарычных навук Віктара Уладзіміравіча Чараўко праводзяцца сістэматычныя археалагічныя даследаванні пахавальных помнікаў XIV–XVIII ст. на Падзвінні.

Намаганнямі супрацоўнікаў універсітэта сфарміравана моцная база для правядзення археалагічных раскопак, створана паўнавартасная лабараторыя па камеральнай апрацоўцы старажытных артэфактаў. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт актыўна супрацоўнічае з Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам, які забяспечвае захаванне знаходак, з Нацыянальнай Акадэміяй навук Беларусі, з Дзяржаўным Эрмітажам (Санкт-Пецярбург, Расійская Федэрацыя).

У выніку сістэматычных раскопак полацкіх археолагаў сфарміравалася багатая антрапалагічная калекцыя, прадстаўленая матэрыяламі гарадскіх і вясковых пахаванняў з тэрыторыі Полацка і Полацкай зямлі. Дзякуючы навуковай дзейнасці антраполага, кандыдата біялагічных навук Вольгі Антонаўны Емяльянчык Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт з'яўляецца другім пасля Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі навуковым цэнтрам антрапалагічных даследаванняў. Старажытнае насельніцтва Беларускага Падзвіння вывучаецца па комплекснай праграме, якая ўключае астэаметрыю, палеадэмаграфію, рэгістрацыю паталогій і шкілетных індыкатараў стрэсу. Антрапалагічныя даследаванні дазваляюць прасачыць гісторыю фарміравання насельніцтва Беларускага Падзвіння, старажытныя міграцыі і міжэтнічныя кантакты, даведацца пра стан здароў'я і ўмовы жыцця нашых далёкіх продкаў. У галіне антрапалогіі развіваюцца і міжнародныя кантакты. Сумесныя навуковыя даследаванні праводзяцца ў супрацоўніцтве з расійскімі

антраполагамі з Інстытута этналогіі і антрапалогіі ім. М.М. Міклуха-Маклая Расійскай акадэміі навук, Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Развіваюцца кантакты з літоўскімі і ўкраінскімі антраполагамі.

У апошні час на кафедры актывізаваліся ўласна гістарычныя даследаванні. Так, на працягу некалькіх год з'явіўся шэраг цікавых навуковых прац, прысвечаных малавядомым старонкам гісторыі Полацка і Полацкай зямлі. Унікальнасць дадзенага напрамку заключаецца ў тым, што кожны перыяд гісторыі Беларусі мае свайго непаўторнага спецыяліста.

Перыяд Полацкага княства і звязаныя з ім падзеі палітычнага жыцця ў абсалютнай кампетэнцыі кандыдата гістарычных навук Юрыя Мікалаевіча Кежа. Віктар Уладзіміравіч Якубаў, кандыдат гістарычных навук, займаецца вывучэннем грамадска-палітычнай, ваеннай і эканамічнай гісторыі Рэчы Паспалітай і Паўночнай Еўропы другой паловы XVI–XVII стст.

XVIII–XIX стст. – адзін са складаных перыядаў у гістрыі Беларусі – у сферы навуковай дзейнасці кандыдатаў гістарычных навук Сяргея Алегавіча Шыдлоўскага і Сяргея Яўгенавіча Глазырына, а таксама магістра гістарычных навук Яўгена Уладзіміравіча Глазырына. С.А.Шыдлоўскі займаецца вывучэннем культуры беларускага прывілеяванага саслоўя, а таксама этнічнай гісторыі Беларускага Падзвіння, займаецца перакладам і публікацыяй польскамоўных мемуарных крыніц. С.Я. Глазырын даследуе грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў другой палове XIX – пач. XX ст. Ён жа падрыхтаваў да выдання навуковую працу, прысвечаную падзеям паўстання 1863 года на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Я.У. Глазырын на падставе архіўных і гістарычных крыніц стварыў падрабязны летапіс падзей вайны 1812 года на Полаччыне, актыўна займаецца вывучэннем дзейнасці Полацкай езуіцкай акадэміі і Полацкага кадэцкага корпуса, складае гісторыка-біяграфічны слоўнік выдатных выкладчыкаў і выпускнікоў гэтых навучальных устаноў.

Былыя выпускніцы Полацкага ўніверсітэта, кандыдаты гістарычных навук Алена Мікалаеўна Барун, Наталля Віктараўна Даўгяла і Галіна Міхайлаўна Мыслівец, на працягу 10 год займаюцца вывучэннем канфесійнага жыцця Беларусі XIX – першай паловы XX стст.

20–30-ыя гг. XX ст. – спрэчны і неадназначны перыяд у развіцці беларускай дзяржаўнасці. Непасрэдна даследаваннем гэтага перыяду з адкрыццем і ўвядзеннем ў навуковы зварот новых архіўных дакументаў і фактаў займаюцца кандыдаты гістарычных навук Алена Вячаславаўна Сумко і Аляксей Леанідавіч Радзюк.

У згаданых вышэй напрамках актыўна развіваюцца міжнародныя кантакты з Ягелонскім універсітэтам (Польша), Варшаўскім універсітэтам (Польша) і Інстытутам гісторыі Польскай акадэміі навук.

Даследаванне перыяду Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны – праблема Халакосту, пытанні паўсядзеннага жыцця падчас нацысцкай акупацыі – у сферы кампетэнцый кандыдата гістарычных навук Алесі Іосіфаўны Корсак. Апошнім часам адным з прыярытэтаў у межах выканання Дзяржаўнай праграммы на 2015–2020 гг. па ўвекавечанні памяці ахвяр вайны, у тым ліку і Вялікай Айчыннай, з'яўляецца праца над верыфікацыяй і ўстанаўленнем новых імён загінуўшых падчас ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі у цэлым і на Полаччыне ў прыватнасці на працягу 1941–1944 гг. Адным з вынікаў дадзенай працы з'яўляецца стварэнне электроннага рэсурсу ў межах навукова-адукацыйнага праекта "Полацк. Вызваленне. Памяць", які рэалізуецца сумесна са студэнтамі і магістрантамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і супрацоўнікамі Музея баявой славы СШ № 2 г. Наваполацка.

Навуковыя набыткі па ўсіх азначаных накірунках падсумоўвае канферэнцыя «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў», якая праводзіцца на бадзе Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта кожныя два гады. Канферэнцыя стала знакавым форумам не толькі для беларускіх гісторыкаў, археолагаў, антраполагаў, этнолагаў і фалькларыстаў, але збірае зацікаўленых даследчыкаў з Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі.

Безумоўна, навуковая школа па вывучэнні гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, антрапалогіі Беларускага Падзвіння – непаўторная і ўнікальная з'ява на навуковай прасторы Віцебскага рэгіёна і ў некаторым сэнсе з'яўляецца працягам тых традыцый, якія былі закладзены яшчэ навукоўцамі першай на Беларусі вышэйшай установы адукацыі Полацкай Іезуіцкай Акадэміі, у сценах якой і адбываецца падрыхтоўка кадраў гістарычнай спецыяльнасці.

*Кафедра гісторыі і турызму*
*Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*